БАЦЬКАЎШЧЫНА

WHITERUTHENIAN WEEKLY „THE FATHERLAND“ Цана 30 н. фэн., для заграніцы — 50 н. ф.

№ 9(53) 6 КРАСАВІКА 1949 Г. ГОД ВЫДАНЬНЯ 3

МАСКВА ПРАТЭСТУЕ І НАСТУПАЕ

ВОЙСТРАЯ НОТА САВЕЦКАГА САЮЗУ

Савецкі Саюз 1 красавіка ўручыў пратэстацыйную ноту ўрадам сямі дзяржаваў, што зьяўляюцца закладчыкамі Атлянтыцкага пакту, у якой гэты пакт названы «выразна агрэсыўным», скіраваным супраць Савецкага Саюзу. Далей Саветы зазначаюць, што пакт нарушае існуючыя брытанска-савецкую і французка-савецкую ўмовы, умовы, заключаныя ў Ялце і Патсдаме, далей цьвердзіцца, што ён таксама супярэчыць пастановам Хартыі Задзіночаных Нацыяў. Нота гаворыць, што ўсе мерапрыемствы заходніх гаспадарстваў вядуць да павялічэньня неспакою й выклікаюць псыхозу вайны, патрэбную толькі для «ваенных падбухторшчыкаў». Гэты-ж пакт — гаворыцца ў ноце — падважвае асновы Задзіночаных Нацыяў.

Саветы стараюцца ў ноце давесьці, што Атлянтыцкі пакт у ніякім выпадку ня можа быць супрацьмерай на ўмовы й збліжэньні Саветаў з сатэліцкімі дзяржавамі, бо гэтыя апошнія маюць на мэце толькі абарону перад нямецкім імпэрыялізмам. Затое Атлянтыцкі пакт, які ўключае ў сябе цэлыя групы дзяржаваў, за выключэньнем Саветаў, і мае на мэце прыцягнуць да сябе й Нямеччыну, скіраваны — гаворыцца ў ноце — «супраць Савецкага Саюзу».

ЦІСК НА ФІНЛЯНДЫЮ Й БАЛКАНЫ

У сувязі з бліскучым посьпехам у зарганізаваньні Атлянтыцкага пакту, Масква распачала ўзмоцнены наступ супраць Захаду. У першую чаргу яна ўзмоцніла свой ціск на Фінляндыю, якой дасюль удавалася весьці незалежную палітыку ад СССР. Апошнім часам «Праўда» зьмясьціла цэлы рад напасьлівых артыкулаў, у якіх галоўна закідаецца, што Фінляндыя варожа ставіцца да Саветаў, патаемна зброіцца й жадае прылучыцца да антысавецкага блёку, арганізаванага Вялікабрытаніяй і ЗША. Таксама апошнім часам дэструкцыйная дзейнасьць фінскіх камуністых значна закатывізавалася.

Адначасна з гэтым значна ажывілася савецкая дывэрсыя й на Балканах. Апошнім часам альбанская дэлегацыя на чале з прэм'ерам Годжы наведала Маскву, дзе была прыняцая Вышынскім і Мікаянам. Афіцыйнай мэтай дэлегацыі было ўзмацненьне гаспадарскіх дачыненьняў паміж СССР і Альбаніяй, аднак палітычныя колы Захаду бачаць у гэтым выразна палітычныя мэты. Уважаецца, што Саветы прыгатаўляюць у Альбаніі пляцдарм супраць Грэцыі й Югаславіі. Падчас дыскусіі ў брытанскім парлямэнце аб небясьпечнай сытуацыі на Балканах, адзін з паслоў заявіў: «Думаю, што Масква плянуе раптоўны палітычны ўдар, каб за адным зьнішчыць Грэцыю й Югаславію». Захады аб стварэньні Македонскай рэспублікі зьяўляюцца выразным мерапрыемствам супраць Грэцыі й Югаславіі. Амэрыканскія журналістыя браты Эльзоп, якія нядаўна адведалі Югаславію, падалі да ведама, што агенты Крамля ўжо два разы прыгатаўлялі замах на Тыта.

Многазначным мамэнтам у югаслаўскіх падзеях ёсьць тое, што паслы Савецкага Саюзу й іншых дзяржаваў камінформу апошнімі днямі выехалі зь Югаславіі.

КАМУНІСТЫЧНЫ «КАНГРЭС МІРУ»

Аднэй із формаў узмоцненага савецкага наступу супраць Захаду й створанага ім Атлянтыцкага пакту было зарганізаваньне бальшавікамі ў Нью-Ёрку г. зв. «Кангрэсу Міру». Гэты кангрэс, на які зьехаліся мноства інтэлектуалістых з цэлага сьвету, між імі ня мала савецкіх агентаў, быў умела выкарыстаны бальшавікамі, якія пераконвалі тут аб «мірнай» палітыцы Савецкага Саюзу й аб «ваенных плянах» капіталістычнага Захаду. Падчас кангрэсу адбыліся ў Нью-Ёрку вялікія дэмнстрацыі, у якіх узялі ўдзел уцекачы-эмігранты з акупаваных бальшавікамі краёў. Яны несьлі свае нацыянальныя сьцягі, перавязаныя, на знак жалобы, чорнай крэпай, і траспаранты з супрацьсавецкімі лёзунгамі.

ДАЛЕЙШЫЯ ЗЬМЕНЫ НА АДКАЗНЫХ СТАНОВІШЧАХ СССР

Ад часу зьняцьця Молатава й Мікаяна із займаных імі становішчаў да гэтага часу адбылося ўжо 12 зьменаў на кіраўнічых становішчах Савецкага Саюзу. Апошняй такой зьменай было адкліканьне Булганіна із становіща міністра збройных сілаў СССР і замена яго маршалам Васілеўскім.

Васілеўскі зьўляецца правай рукой ген. Жукава. Пасьля перамогі пад Сталінградам быў ён назначаны шэфам генэральнага штабу. Але ў мінулым годзе быў зьняты й з гэтага становішча з прычыны быццам «пераабцяжаньня працай».

У ацэне ўсіх гэтых зьменаў на Захадзе існуюць дзьве розныя вэрсыі. Адна зь іх гаворыць, што Сталін з прычыны цяжкага стану здароўя гэткім спосабам перадае ўладу ў рукі сваіх наступнікаў, якіх уважае за найбольш адпаведных. Другая вэрсыя гаворыць, што пры помачы гэтых зьменаў Крэмль, які праіграў «халодную вайну», мае запачаткаваць вастрэйшую палітыку супраць Захаду. Некаторыя палітыкі лічацца навет з фактам хуткага выхаду Саветаў з Задзіночаных Нацыяў. Адно ясна, што падчас гэтых зьменаў найбольш важныя дзяржаўныя рэсорты перадаюцца цяпер у рукі здольных спэцыялістых, якія дагэтуль былі абсаджаныя палітыкамі.

ПАДПІСАНЬНЕ АТЛЯНТЫЦКАГА ПАКТУ

У Вашынгтон зьехаліся ўжо міністры тых дзяржаваў, што маюць падпісаць 4 красавіка Атлянтыцкі пакт. Перад падпісаньнем адбудуцца важныя нарады ў справе завостранай сытуацыі на Балканах. Міністры трох вялікіх гаспадарстваў будуць таксама радзіць над праблемаю Нямеччыны. Перад тым, як Нямеччына будзе дапушчана да пакту, мусіць быць вырашаны цэлы рад праблемаў, што тычацца нутранага палажэньня Нямеччыны.

Закладчыкамі Атлянтыцкага пакту зьяўляюцца, як ведама, сем наступных дзяржаваў: ЗША, Вялікабрытанія, Францыя, Канада, Бэльгія, Галяндыя й Люксэмбург. Але й іншыя дзяржавы могуць далучыцца да пакту. У вапошнім часе заявілі аб сваім прылучэньні да пакту пяць новых дзяржаваў, у тым ліку Італія, Нарвэгія й Данія.

КАМУНІСТЫЯ ПАЦЯРПЕЛІ НЯЎДАЧУ

Падчас кантанальных выбараў у Францыі, якія закончыліся 27 сакавіка, урадавы блёк атрымаў 699 мандатаў, партыя дэ Голя — 389, а камуністыя толькі 37. Як бачым, камуністыя пацярпелі вялікую няўдачу, галоўным чынам із за таго, што ў выбарнай кампаніі яны асабліва войстра выступалі супраць Атлянтыцкага пакту.

КАМУНІКАТ

ЗАМЕЖНАГА СЭКТАРУ БЕЛАРУСКАГА НАЦЫЯНАЛЬНАГА ЦЭНТРУ

13 — 14 сакавіка сёлета ў вадным з гарадоў Нямеччыны адбыўся чарговы зьезд Замежнага Сэктару Беларускага Нацыянальнага Цэнтру (БНЦ). Зьезд разьвязаў важнейшыя пытаньні нутраное й вонкавае палітыкі й намеціў у сваіх пастановах кірунак далейшае працы Замежнага Сэктару БНЦ.

Цьвёрда стоячы на ранейшых пазыцыях ахоўваньня нацыянальнае ідэі й змаганьня за чысьціню нацыянальнае ідэалёгіі, Зьезд уважае за канечна патрэбнае на сяньня **ўзмоцніць адпорнасьць варожым чужанацыянальным плыням,** зь якога-б боку яны ня пранікалі ў асяродзьдзе беларускае эміграцыі.

Бяручы на ўвагу тыя зьмены, якія ў бліжэйшым часе маюць адбыцца ў жыцьці нашае эміграцыі, Зьезд пастанавіў зьмяніць таксама арганізацыйныя формы працы Замежнага Сэктару БНЦ, датасаваўшы іх да вымогаў часу. У сувязі з апошнім зменены й, пэрсанальны склад кіруючых органаў БНЦ.

Эміграцыя, 15.3.1949.

Замежны Сэктар
Беларускага Нацыянальнага Цэнтру.

ПАСЕДЖАНЬНЕ ПРЭЗЫДЫЮМУ РАДЫ БНР

У вадным із гарадоў заходняй Нямеччыны адбылося 14 сакавіка сёлета чарговае паседжаньне Прэзыдыюму Рады БНР у прысутнасьці сп. Прэзыдэнта БНР інж. М. Абрамчыка. На паседжаньні прэм'ерміністраў Ураду БНР даў справаздачу аб дасюлешняй дзейнасьці Ураду, падчырківаючы асабліва ягоную інтэнсыўную дзейнасьць у галіне вонкавых дачыненьняў. Апрача гэтага былі шырака прадыскутаваныя й разьвязаныя многія іншыя праблемы беларускага палітычнага жыцьця.

УСХОДНЯЯ І ЦЭНТРАЛЬНАЯ ЭЎРАПЭЙСКАЯ ВУНІЯ

Нас паведамляюць, што 19 лютага сёлета ў Швэдыі эстонская,, латыская, летувіская, польская, украінская, чэская, славацкая, мадзярская і беларуская палітычная эміграцыя ўканстытуавалі абаронны дзяржаўны блёк пад назовам: Усходняя і Цэнтральная Эўрапэйская Вунія. Такім чынам быў закладзены фундамант пад нашую й нашых суседзяў будучыню ў форме злучаных дзяржаваў Эўропы.

УСЕ НА МАНІФЭСТАЦЫЮ

СУПРАЦЬ ПЕРАСЛЕДВАНЬНЯ РЭЛІГІІ Й СУПРАЦЬ КОНЦЛЯГЕРАЎ СССР І САТЭЛІТАЎ!

Прэсбюро АБН паведамляе, што ў **нядзелю,** 10-га красавіка 1949 г. а 10-й гадз. рана адбудуцца ў **Мюнхэне,** на **Кёнігпляцы** (без увагі на пагоду) урачыстыя

П А Н І Х І Д Ы

розных веравызнаньняў за рэлігійных і нацыянальных мучанікаў і герояў, а таксама ахвяраў канцлягераў.

Пасьля Багаслужбаў — **Вялікае пратэстацыйнае сабраньне палітычных эмігрантаў** бальшавізмам паняволеных народаў супраць **Концлягераў** і пераследваньня **Рэлігіі** ў СССР і васальных краінах.

Пасьля адбудзецца маніфэстацыйны **паход** вуліцамі гораду.

Ініцыятыўны Камітэт заклікае прадстаўнікоў усіх народаў прыняць масовы ўдзел у магутным пратэсьце супраць бальшавіцкага тэрору й насільля над народамі й чалавекам.

Даезд трамваямі 1 і 4 да Шчыгельмайер пляцу й 8 да Каролінэр пляцу.

НЕ ЗЬНЕВАЖАЙЦЕ НАРОДНЫХ СЬВЯТАСЬЦЯЎ!

У кажнага народу ёсьць такія гістарычныя мамэнты, якія, з гледзішча на іхнае значэньне ў ягоным жыцьці, падносяцца ім да вышыні нацыянальных сьвятасьцяў. Яны звычайна бываюць авееныя німбам асаблівай пашаны. Іх ня важыцца зьняважаць, спрафанаваць зганьбіць ніхто, у каго ёсьць у сэрцы хоць трохі сумленьня, нацыянальнага пачуцьця ці людзкой годнасьці. Найвялікшай такой сьвятасьцю для нас беларусаў зьяўляецца векапомны Акт 25 Сакавіка, у якім беларускі народ вуснамі выбраных ім прадстаўнікоў выявіў сваю цьвёрдую волю быць поўным і незалежным гаспадаром на сваей собскай зямлі. Незалежніцкая ідэя Акту 25 Сакавіка, ня зьдзейсьненая не з нашай віны ў той час, сталася і ў далейшым найвялікшай і сьвятой ідэяй беларускага народу.

Дык як-жа дзікім і антынацыянальным выглядае імкненьне зарубежнікаў, якія ўсімі сіламі намагаюцца падважыць значэньне Акту 25 Сакавіка, абязначыць Першы Усебеларускі Кангрэс, які прывёў да гэтага Акту, здыскрэдытаваць Раду БНР, якая зьяўляецца адзінапраўным носьбітам нашае незалежніцкае ідэі, выражанае ў гэтым Акце. Гэтая антыбеларуская акцыя праводзіцца так нахабна, што з мэтаю падважаньня значэньня, паменшаньня запраўднае вартасьці нашых агульнанародных дасягненьняў зарубежнікі бессаромна хвальшуюць і перакручваюць гістарычныя факты, перададзеныя нам у аўтэнтычных дакумэнтах і захаваныя ў жывой памяці непасрэдных сьветкаў і ўдзельнікаў дадзеных падзеяў.

Вось найбольш яскравыя факты:

У нумары 4(5) «Беларускага Слова» даслоўна чытаем, што Першы Усебеларускі Кангрэс «не пасьпеў скончыць свае вялікае працы — яго разагналі бальшавікі». А ў нумары другім гэтае-ж газэты, здаецца, той-жа самы аўтар паясьняе, што пасьля разгону Кангрэсу «толькі трупа ў колькасьці 70 чалавек засталася ў Менску і на агульным сходзе вылучыла Беларускую Народную Раду, якая 25 Сакавіка 1918 г. абвесьціла незалежнасьць Беларусі. Ясна, што пры такой злоснай інтэрпрэтацыі значэньне самога Кангрэсу, які быццам «не дакончыў сваей працы», і абвешчаны выбранай усяго 70 ўдзельнікамі Кагрэсу (на агульную колькасьць 1.167 дэлегатаў з правам пастанаўляючага голасу) Радай Беларускай Народнай Рэспублікі Акт 25 Сакавіка зводзяцца на нішто, бо ў такім выпадку ўзапраўды нельга было-б гаварыць ані аб праўнасьці ані аўтарытэтнасьці гэтага Акту.

А як-жа было ў запраўднасьці? Кажны хоць трохі граматны беларус добра ведае, і Вы ў тым ліку, спадар аўтар, што Першы Усебеларускі Кангрэс у ночы 30(17) сьнежань 1917 г. быў узапраўды разагнаны бальшавікамі, але працу сваю давёў да канца. Ня 70 чалавек, але ўвесь Кангрэс назаўтрае сабраўся ў чыгуначным дэпо й пад аховай чыгуначнікаў адбыў сваё апошняе паседжаньне, на якім ён ніякай Рады не выбіраў, бо была яна выбраная перад разогнам, але толькі перадаў ей свае паўнамоцтвы аж да часу магчымых вольных выбараў у вольнай Беларусі. Дык з праўнага гледзішча ўсё тут было ў парадку.

Далей у тым-жа № 4(5) «Беларускага Слова» чытаем, што «Рада Белкарускай Народнай Рэспублікі на чале з доктарам Іванам Серадой зрабіла трагічную памылку: яна паслала тэлеграму нямецкаму кайзэру Вільгельму, каб той узяў Беларусь пад сваю апеку. Гэтага факту было досыць, каб народ і нацыянальны актыў адвярнуліся ад Рады».

Дык прымеце, спадар аўтар, да ведама, што не Рада пасылала тэлеграму нямецкаму кайзэру Вільгельму, але толькі 7 сяброў Рады із 43, і што крок іхны быў потым асуджаны й давёў да часовага ўрадавага крызысу. Ды як Вы можаце цьвердзіць, што «народ і нацыянальны актыў адвярнуліся ад Рады», калі ўзапраўднасьці пад ейным правадырствам гэты-ж народ вёў яшчэ некалькі год збройнае змаганьне з бальшавікамі із слаўным Слуцкім паўстаньнем на чале? Але калі-б, прыкладам, і Рада выслала гэтую тэлеграму Вільгельму, дык як хватае ў Вас сумленьня так безапэляцыйна абніжаць ейны аўтарытэт, калі Ваш г. зв. «другі кангрэс» ня толькі выслаў вернападданчую тэлеграму Гітлеру, але й быў скліканы, інсьпіраваны й дырыгаваны нямецкім генэралам СС. А Вы ў тым-жа артыкуле, толькі трохі далей, адважваецеся цьвердзіць, што гэты «другі кангрэс» быў поўным выяўленьнем волі ўсяго народу, а створаная нямецкім акупантам Беларуская Цэнтральная Рада зьяўляецца й сяньня адзінапраўным беларускім урадам. Дзе-ж тут лёгіка?

Ня вытрымлівае найменшае крытыкі й далейшая Вашая спроба абнізіць значэньне Акту 25 Сакавіка цьвердженьнем, што «Першы Усебеларускі Кангрэс адбыўся даўно; ужо няма тых людзей, якія абвяшчалі незалежнасьць Беларусі 25 Сакавіка 1918 г.». Дык дазвольце выясьніць, што сябры Рады Беларускай Народнай Рэспублікі абвяшчалі незалежнасьць Беларусі не для сябе й не на час свайго жыцьця, але для ўсяго беларускага народу і з вольна выяўленай волі гэтага народу. А таму праўная моц Акту 25 Сакавіка ня скончылася ізь сьмерцю ягоных лварцоў; яна ёсьць вечная.

Далей Вы цьвердзіце, што першы Старшыня Рады БНР др. І. Серада зрокся свайго становішча й што ўжо пазьней на эміграцыі быў абраны на яго месца

П. Крычэўскі. Няпраўда! І. Серада пакінуў сваё становішча на Бацькаўшчыне ў 1919 г. і там-жа быў абраны П. Крычэўскі. Дык і гэтым псэўдааргумэнтам аслабіць цягласьць праўнасьці Рады БНР аніяк нельга.

Але найбольш нахабным з ўсіх зарубежніцкіх наступаў на БНР ёсьць часта паўтаранае імі цьверджаньне, што Рада БНР спыніла сваю дзейнасьць і самазьліквідавалася падчас Бэрлінскай канфэрэнцыі 12 — 15 кастрычніка 1925 г. Аб гэтым цьвердзілася яшчэ ў брашуры, напісанай і выданай пад прозьвішчам М. Шалы, «А што далей?», потым у Лёнданскім «Аб'яднаньні», а цяпер-жа ў вапошнім нумары «Беларускага Слова» , таксама паўтараецца, што «гістарычная Рада БНР, абраная 1 Кангрэсам, спыніла сваё існаваньне 20.10.1925 г. у Вэрліне».

Гэтая зарубежніцкая хлусьня была ў папярэднім нумары «Бацькаўшчыны» ў вартыкуле «Незалежніцкі шлях БНР» шырака здэмэнтаваная й было там дакумэнтальна даведзена, што не Рада БНР, але толькі тры былыя сябры Ўраду, злажыўшы перад гэтым сваю дымісію, на Бэрлінскай канфэрэнцыі сталі на савецкай пазыцыі й потым выехалі ў БССР. Затое Прэзыдыюм Рады БНР, як адзіны праўна ўпаўнамочаны орган да рэпрэзэнтаваньня волі Першага Кангрэсу, сурова закляйміў гэты паступак трох былых сяброў толькі выканальнаго органу — Ураду БНР. У дапаўненьне да ўспомненага артыкулу з «Бацькаўшчыны» падаём тут спраставаньне ў гэтай справе Старшыні Рады БНР П. Крычэўскага, зьмешчанае ім у Ковенскай газэце «Эхо» 15.12.1925 г. і пазьней у «Бюлетэні Рады БНР» за 19.1.1926 г. У ім чытаем: **«На нарадзе пытаньне аб мандатах падымалася, але пасьля таго, як стала ведама, што Ўрад яшчэ 4 кастрычніка г.г. падаў мне адстаўку, яно адпала. Авантурызм такой пастаноўкі пытаньня — перадачы мандатаў Савецкай Беларусі — сам па сабе сьветчыць аб поўнай глупоце ініцыятараў гэтага замыслу. У роўнай ступені ён разьлічаны й на несьвядомасьць тых камуністычных дыпляматаў, якія вялі торг за гэтыя мандаты.**

Мандаты павінны быць зьвернуты таму, ад каго яны атрыманы. Няўжо-ж у пяжкі момант Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік, іх Саюзу прыйдзе ў галаву думка перадаваць суверэнныя правы рускага народу Кітаўскаму Імпэратару ці Турэцкаму Султану? Правал быў вачавісты і камбінацыя не ўдалася. Аднак гэта не застанавіла новых спрытных падслугачоў савецкай улады — Цьвікевіча, Зайца і Пракулевіча зрабіць падлог і, ня будучы ўжо міністрамі, выдаць ад імя Ўраду пакутную заяву вызнаньня савецкай улады.

Прэзыдыюм Рады такое паступаньне назваў зрадай незалежнасьці Беларусі і ніякай алказнасьці за гэта не нясе, адкінуўшы ў корані юрыдычнае значэньне такой заявы.

Вярхоўная ўлада на тэрыторыі этнаграфічнае Беларусі, згодна пастанове Рады Рэспублікі 13 сьнежаня 1919 г., належыць выключна Прэзыдыюму Рады, які зараз знаходзіцца заграніцай...».

Дык як-жа ананіць тады зарубежніцкія запэўніваньні, што Рада НР на Бэрлінскай канфэрэнцыі 1925 г. самазьліквідавалася й перадала свае мандаты БССР? Каму зь беларусаў патрэбнае такое хвальшывае, супярэчнае з запраўднасьцю цьверджаньне аб ліквідацыі Рады БНР — адзінапраўнага носьбіта суверэнных правоў беларускага народу? Гэтае намаганьне адно толькі можа быць патрэбнае тым, хто намагаўся гэта правесьці, хоць і бяз выніку, на Бэрлінскай канфэрэнцыі.

Па сьмерці выбранага на Бацькаўшчыне Прэзыдэнта БНР П. Крычэўскага, якая наступіла ў Празе Чэскай у 1928 г., ягоныя паўнамоцтвы перайшлі нармальным парадкам на ягонага заступніка В. Захарку. А апошні, як ведама, умаючы ў 1943 г. прэзыдэнцкія паўнамоцтвы, згодна з агульна прынятым і рэспэктаваным міжнародным правам звычаем, перадаў тэстамэнтам сучаснаму Прэзыдэнту ВНР інж. М. Абрамчыку. Тэкст гэтага тэстамэнту быў зьмешчаны ў папярэднім нумары «Бацькаўшчыны» і толькі з тэхнічных прычынаў не магла ў тым-жа нумары быць зьмешчаная ягоная фотакопія.

Ня гледзячы аднак на гэта, «Беларускаму Слову» хапіла бессаромнасьці напісаць у ўспомненым нумары наступнае: «Яны (г. зн. «крывічы» — Рэд.) прыдумалі нейкі тэстамэнт памёрлага дзеяча Захаркі, якога выдаюць за прэзыдэнта, нібыта абранага на першым кангрэсе».

З усяе гэтае й падобнае іншае пісаніны «Беларускага Слова» напрашваецца вельмі сумны вывад. Людзі, якія, дзеля маскаваньня свайго запраўднага аблічча, заяўляюць, што й яны стаяць на Акце 25 Сакавіка й нават сьвяткуюць ягоную гадавіну, у запраўднасьці зьневажаюць гэты вялікі Акт і тую сьвятую для кажнага беларуса ідэю, якую ён выражае. Мала аднак гэтага! Мала таго, што самі зьневажаюць наш незалежніцкі Акт і зьвязаныя зь ім нацыянальныя дасягненьні, але шляхам сьвядомага перакручваньня й хвальшаваньня гістарычных фактаў, стараюцца здыскрэдытаваць яго й абнізіць ягонае эпахіяльнае значэньне ў вачох шырокіх масаў беларускае эміграцыі. Каму ўсё гэта патрэбнае й для чыіх інтарэсаў усё гэта робіцца? Пэўне-ж не для інтарэсаў беларускага народу й ягонае нацыянальна-вызвольнае ідэі, за якую ўсьцяж ён змагаецца й за якую сяньня церпіць нячуваны зьдзек у ўмовах бальшавіцкае няволі, але толькі ў інтарэсах тых варожых, нашаму народу сілаў, што хочаць яго закабаліць у вечную няволю.

Усё гэта, як ня трэба лепей, сьветчыць аб тым, што зь сябе прадстаўляе «Беларускае Слова» й той палітычны кірунак, якога органам яно зьяўляецца.

Я. К.

У СУСЬВЕТНЫМ АБ'ЕДНАНЬНІ БЕЛАРУСКАЙ ЭМІГРАЦЫІ

Дэлегацыя ад Управы Сусьветнага Аб'яднаньня Беларускай Эміграцыі (САБЭ) нядаўна наведала аргентынскага амбасадара ў Парыжы ў справе дапушчэньня беларусаў ў Аргентыну зь Нямеччыны і ўсіх іншых беларусаў, прадстаўленых органамі САБЭ. Апрача таго дэлегацыя дагаварылася, што САБЭ будзе ўважацца за арганізацыю, маючую права выстаўляць пасьветчаньні маральнасьці для беларусаў, жадаючых выехаць у Аргентыну.

ГАНДЛЯРЫ НА ТРЫБУНЕ

АСТРОЎСКІ АДКРЫЎ СВАЕ КАРТЫ
(Ад собскага карэспандэнта)

На гэты раз маўчаць ня можам, ня маем права, бо калі будзем маўчаць, дык гэтым прычынімся да найвялікшага злачынства ў дачыненьні да сьвятога нам векапомнага Акту 25 Сакавіка.

Ужо ад даўжэйшага часу лягер у Гановэры, дзе жыве даволі шмат беларусаў, быў прыцягальным пунктам для наездаў і выступленьняў зарубежнікаў.

Да нас прыяжджалі меншыя й большыя «дзеячы» зарубежніцтва, адныя пра нешта шапталіся зь мясцовымі «дзеячамі», іншыя выступалі ў ролі больш «саліднай» і публічнай, — у ролі лектараў. Як кажуць, карты адкрыліся ў часе паніхіды ў лягернай беларускай царкве па загінуўшых гэраічных удзельніках славутага Слуцкага паўстаньня. На паніхіду ня прыйшоў ушанаваць памяць загінуўшых гэрояў Слуцкага паўстаньня ніводзін з трох настаўнікаў пачаткавай школы, затрымаўшы ад удзелу ў паніхідзе й вучняў. Пасьля прыйшлі запозьненыя выбары ў гэтак званы дапамаговы камітэт, на якія былі запрошаныя чысьцюсенькія расейскія недзялімцы, зь якімі гэтак сардэчна вітаўся Коўш і ягоныя супрацоўнікі, публічна дэманструючы зь імі сваю салідарнасьць і залічаючы іх у беларускі актыў.

НАШАЯ МІНУЎШЧЫНЯ ВАЧЫМА ЗАРУБЕЖНІЦКАГА ЛІДЭРА

Аж на гэты раз пачаставаў нас сваей прысутнасьцю й сам найбольшы патрон зарубежнікаў, сам «прэзыдэнт» БЦР, які сяньня мае іншых і даўно знаных нашаму народу патронаў, а які яшчэ нядаўна меў апякуна з гэткай кароценькай і недаўгавечнай, хоць і генэральскай сямейкі — СС, пра якую, хоць і крыху сьціплавата, было ўспомнена й гэты раз (нельга-ж быць няўдзячным дабрадзейнаму «гэру»).

Гэта было 24 сакавіка і было не ўшанаваньнем вялікага Акту, але зьдзекам і зганьбаваньнем нацыянальнае ўрачыстасьці. Адзін зь мясцовых «дзеячоў» шматзначна абвесьціў прысутным: «Сяньня мы маем вялікую радасьць і шчасьце, бо перад намі выступіць наш прэзыдэнт прафэсар Астроўскі, які вылажыць праўду нашага змаганьня». Прэзыдэнцкае «выкладаньне» трывала блізу дзьве гадзіны, бо на гэты раз іхная мосьць наважыла зганьбіць ня толькі недалёкае мінулае нашага народу, а сягнула аж у трохсотгадовую гісторыю.

Для кажнага патрыёты гісторыя свайго народу зьяўляецца перадусім змаганьнем народу за сваё нацыянальнае існаваньне. З гэтага і з толькі гэтага гледзішча ён падыходзіць і да мінулых і да сучасных яму падзеяў, адно гэта вызначае ацэну гэтых падзеяў.

А што мы пачулі? Былы служака з былых г. зв. «ўсходніх крэсаў» сяньня быў на дзіва лагодным да гаспадароў ужо ня «крэсаў», а непадзельнасьці, як сяньня кажуць, «русских народов». Ці не таму ён, «па прафэсарску» інтэрпрэтуючы гісторыю нашага народу, не адважыўся ўспомніць аб няпрымірымасьці нашых нацыянальна-вызвольных імкненьняў з палітыкай расейскага імпэрыялізму, ці не таму ён «забыўся» расказаць прысутным пра многія крывавыя расправы расейскага царызму над беларускім народам, а калі й гаварыў сёе-тое, дык гэтак лагодненька ды абыякава, нібы баючыся ўгнявіць яшчэ й сяньня жывучага ворага. Няўжо гэта робіцца, як заўважыў мой сусед, дзеля таго, каб заслужыць на новыя, ужо ад іншага магчымага гаспадара, прэзыдэнцкія лаўры, бо першыя давялося выкінуць з прычыны тандэтнасьці маркі.

Ня будзем спыняцца на ўсім, што Вы, паважаны прафэсару, як Вас незаслужана называюць, гаварылі пра гісторыю не свайго, а нашага беларускага народу і што сьветчыць ня гэтулькі пра прафэсарскую адукацыю, толькі пра злоснае фальшаваньне гэтак дарагога кажнаму беларусу.

Вось некалькі прыкладаў:

Асоба Кастуся Каліноўскага зьяўляецца постацяй мужнага нацыянальнага героя, які загінуў на маскоўскай шыбеніцы, а паўстаньне, зьвязанае зь ягоным імем — найвышэйшым выяўленьнем нашае нацыянальнае сьведамасьці ў мінулым стагодзьдзі. Паважаны прафэсару, навет нашыя дзеці зь першых гадоў навучаньня ўжо ведаюць, што Каліноўскі быў правадыром беларускага сялянскага паўстаньня супраць расейскае няволі. Гэта-ж Каліноўскі даходзіў ужо да разуменьня канечнай патрэбы нашага дзяржаўнага незалежніцтва. Дык ці-ж ня зьдзекам над нацыянальным героем і ці-ж ня зьдзекам над змаганьнем нашага сялянскага народу было дазволіна сказанае Вамі, што Каліноўскі **«посьпеху ня меў, бо ўблытаўся ў гісторыю з палякамі»?** Каму патрэбнае гэтае аплёўваньне найвыдатнейшага мамэнту гісторыі нашага народу? Хіба толькі тым, хто праз увесь час намагаўся адабраць ад яго свабоду?

Нам добра ведамая зацятасьць расейскага царызму ў змаганьні зь беларускім вызвольным рухам. Гэта калі пачалі масы ўлучацца ў гэтае змаганьне, ён выдаў загад пра забарону друкаваць што-небудзь у беларускай мове, каб выбіць з рук беларускіх патрыётаў гэткую войструю зброю, як друк, каб беларускія масы трымаць і далей у цемры. А Вы, сп. Астроўскі, пра гэты барбарскі закон, які трываў праз некалькі дзесяцігодзьдзяў аж да 1905 году, сказалі, навет падчыркнулі, што ён **«ня прынёс такой шкоды, бо масы былі няпісьменныя».** Вось дык растлумачыў, — нібы абухом па галаве. Калі хочаце апраўдваць расейскі імпэрыялістычны наступ на беларускі народ, дык гаварыце проста мовай гэтага імпэрыялізму, безь ніякіх недагаворак.

ЗЛОСНАЯ ХЛУСЬНЯ ПРА АКТ 25 САКАВІКА

Гістарычнай бясспрэчнай праўдай зьяўляецца тое, што Акт 25 Сакавіка 1918 г. становіць пачатак вышэйшага этапу ў разьвіцьці нашай нацыянальнай самасьведамасьці, нашага нацыянальна-вызвольнага наступу-руху, надаў яму прынцыпова азначаны дзяржаўна-незалежніцкі характар. Ідэя 25 сакавіка зьяўляецца агульна-народнай, сьвятой, якая натхняла й будзе заўсёды натхняць беларускіх патрыётаў у іхным змаганьні за нікім і нічым неабмежаную поўную незалежнасьць Бацькаўшчыны Беларусі.

А што Вы сказалі, сп. Астроўскі?

«Улада валялася на вуліцы» — даслоўна было сказана, навет акцэнтавана, але, відаць, ня было каму падняць гэтай бяспрытульнай улады. Вось як было лёгенька — хапай ды цешся! Гэта папярэджвала ўжо й ацэну, якая будзе дадзеная Першаму Ўсебеларускаму Кангрэсу. Замест таго, каб расказаць прысутным пра ўсенароднасьць Першага Кангрэсу, пра выражэньне ім волі ўсяго народу да стварэньня сваей дзяржаўнасьці (пра што сьветчыць хоць-бы блізу двухтысячная колькасьць дэлегатаў з усіх куткоў Беларусі), — было сказана пра слабасьць і нерашучасьць Кангрэсу, што гэтыя рысы сталіся галоўнымі (на чый погляд?) рысамі характару беларускага народу. Мы і слова ад Вас не пачулі пра ўдзельнікаў Першага Кангрэсу, пра іхнае самаадданае, кіраванае незалежніцкай ідэяй змаганьне, пра тое, што было зроблена гэным Кангрэсам, пра што марылі ягоныя ўдзельнікі, чаму Кангрэс, будучы разагнаным мсакоўска-бальшавіцкім штыхом, не скарыўся, а даканаў сваю працу. Відаць пра гэта ня было сказана толькі таму, што дакладчыку ўсё гэта прыйшлося не па душы.

Сяньня сталася модай навет для нічым непрыкрытых ворагаў заяўляць, што і яны стаяць на Акце 25 сакавіка. Стаяць ці топчаць гэны Акт — варта запытаць? І Вы, сп. Астроўскі, заявілі, што дзень 25 сакавіка зьяўляецца нашым нацыянальным сьвятам. Але адразу за гэтым вымушаным рэвэрансам Вы літаральна сказалі тое, што зводзіць на ніштo гэны Акт: **«Практычнага значаньня Акт 25 сакавіка для шырокіх масаў ня меў».** Як-жа загадаеце разумець гэтыя Вашыя словы? А дзе-ж лёгіка, калі пазьней было сказана, што «пад напорам масаў бальшавікі змушаны былі стварыць БССР»? Адкуль гэныя масы ўзяліся, хто іх прывёў з такім настырлівым патрабаваньнем, зь якім палічыліся навет бальшавікі, ня вельмі ахвочыя наагул з чым-небудзь лічыцца?

ЁН РЭГАБІЛІТУЕ НЯМЕЦКІ ГІТЛЕРЫЗМ!

Ведама, не абыйшлося й без успамінаў і пра г. зв. «другі кангрэс». Было сказана нешта ня зусім цямнае пра нейкае «дапаўненьне» пастанове Першага Кангрэсу. Думаем, што навет самі прыхільнікі Астроўскага былі зьдзіўленыя (бо яны ўсё напіраюць на бадай усенародную выбарнасьць свайго «прэзыдэнта»), пачуўшы словы, што гітлераўская навала **«частку дзяржаўнай улады перадала беларусам»,** больш гэтага — **«навет самі немцы запачаткавалі гэтую ўладу».** Прызнацца, нас зьдзівіла ня гэтае «прэзыдэнцкае» самапрызнаньне што да запраўдных гаспадароў БЦР, колькі «прэзыдэнцкі» цынізм. Якімі дабрачыннымі пасьля гэтага выглядаюць нямецкія нацыстыя, калі верыць Астроўскаму. Няпраўда, што нацыстаўскія горды — гаворыць Астроўскі вышэй згаданымі словамі — прыносілі для народаў сьмерць і зьнішчэньне, беларусам яны далі ўладу. Ведаем, добра ведаем, што яны Вас паставілі да гэткай улады! А пры чым-жа тут беларускі народ? Ці не зарана Вы пачынаеце публічна рэгабіліваць крывякжэрны нямецкі фашызм, калі яшчэ ўвесь сьвет азіраецца на яго, як на самае дзікунскае страшылішча усяго чалавецтва? Мы ведаем, што Вы былі на паслугах гэтай навалы, што выплылі наўзьверх дзякуючы ёй, таму, відаць, у сваім выступленьні навет і не заікнуліся пра тое, што ў часы нямецкае акупацыі на Беларусі, як і ў іншых акупаваных краёх, меў месца нацыянальны рух супраціву, які з кажным днём наносіў акупанту ўсё больш адчувальныя ўдары.

Дык да чаго-ж заклікаў ці не заклікаў прамоўца? Гэта ня было выступленьне, якое заклікала на змаганьне за зьдзейсьненьне нашае сьвятое ідэі нацыянальнае незалежнасьці. Здавалася-б прамоўца закліча да нацыянальнага ўзвышэньня, гарту й мужнасьці, да сьмелага й бескампрамісовага адбіцьця падлыжнага апанаваньня беларусаў рознымі, ад даўна знанымі суседзкімі «ўплывамі». Месца гэтага закліку заступіла шахрайства ў дачыненьні да гісторыі нашага народу. А гэткі заклік асабліва сяньня патрэбны, бо сяньня — у час ліхаманкавага насьпяваньня сусьветнае катастрофы — патрэбнае, як ніколі, задзіночаньне сілаў, а для нас — сілаў нацыянальных, ідэйна ўзброеных, бо ўлада ніколі на вуліцы не валяецца, яе трэба заваяваць. Замест закліку Вы паказыталі простыя душы абыватальскім пацяшаньнем, што праз год пакутнікі ДП вернуцца на Бацькаўшчыну. А ці ведама Вам, што за Бацькаўшчыну трэ будзе яшчэ ці мала крыві праліць, каб абараніць яе ад розных ворагаў?

А што да Вас, паважаны прамоўца, дык не чакаючы навет сустрэчы з Вамі, мы сяньня кажам: не ашукаеце нас і не намагайцеся ўводзіць нас у зман — ня выйдзе! Незалежніцкі сьцяг БНР, узьняты 31 год таму, які акроплены крывёю лепшых сыноў нашага народу, пад якім і сяньня йдзе змаганьне за вызваленьне Беларусі з пад чырвонае маскоўскае навалы — быў і будзе нашым адзіным сьцягам. Зарабляйце на пражыцьцё іншым спосабам! Не хацелася прыгадваць, але самі змусілі згадаць байку аднаго беларускага пісьменьніка, у якой гаварыцца пра падваротню і, калі памяць не зраджае, пры Вас сяньня ўжо трэйцяя падваротня. Дык колькі-ж іх будзе яшчэ?

Гановэр, 27.3.1949 г.

Янка Нясьцерпны.

БЕЛАРУСЫ! Чытайце, пашырайце й выпісвайце адзіную Вашую незалежніцкую газэту на чужыне:

«БАЦЬКАЎШЧЫНУ»!

25 Сакавіка на Чужыне

31-ая гадавіна Акту 25 Сакавіка, на моцы якога была абвешчаная Радаю Беларускай Народнай Рэспублікі вольнасьць і дзяржаўная незалежнасьць нашае Бацькаўшчыны, была адсьвяткавана вельмі ўрачыста ўва ўсіх тых дэмакратычных краінах, дзе толькі знаходзяцца беларусы. Гэтае сьвяткаваньне вылілася ў магутную маніфэстацыю ў чэсьць вялікай нацыянальна-незалежніцкай ідэі 25 Сакавіка й адзінапраўных рэпрэзэнтантаў і носьбітаў гэтае ідэі, якімі зьўляюцца Прэзыдэнт, Рада й Урад БНР.

У дзень гэтага сьвята нас віталі й арганізацыі й установы прыязных нам чужынецкіх народаў, прадстаўнікі якіх, дзе гэта было магчыма, прыймалі таксама й асабісты ўдзел у сьвяткаваньні. Каб захаваць гэтую важную падзею ў нашым нацыянальным жыцьці ў памяці суродзічаў, зьмяшчаем ніжэй частку з прысланых нам справаздачаў аб сьвяткаваньні з тым, што іншыя па магчымасьці будуць зьмешчаныя ў наступным нумары.

СВЯТКАВАНЬНЕ 25-га САКАВІКА У ЛЯГЕРЫ ВІНДЗІШБЭРГЕРДОРФЕ

Сьвяткаваньне 31-ае гадавіны абвешчаньня незалежнасьці Беларусі выпала ў нашым лягеры ў гэтым годзе вельмі ўрачыста. Нават пагода спрыяла сьвяточнаму настрою, быў першы сапраўды веснавы, цёплы, сонечны дзень. Урачыстасьці пачаліся ўжо 24-га ўвечары. Вечар гэты быў прысьвечаны памяці тых, што аддалі сваё жыцьцё за зьдзейсьненьне ідэалу 25-га Сакавіка. На лягерным пляцы сабраліся ў страі аддзел Задзіночаньня Беларускіх Вэтэранаў, скаўты й жыхары лягеру. Пры запаленым скаўтамі вялікім вогнішчы, пасьля кароткае прамовы Старшыні Лягернага Камітэту, быў урачыста апушчаны да паловы машту нацыянальны сьцяг, а прысутныя адсьпявалі жалобны марш на словы Янкі Купалы «Сьпіце ўсе тыя, што праўды на сьвеце шукалі». Затым усе пайшлі ў царкву, дзе была адслужаная паніхіда па палеглых за Бацькаўшчыну. 25-га раніцою, апушчаны ўвечары, сьцяг, быў таксама ўрачыста падняты. А 10-ай гадзіне адбыўся малебен у царкве, а пасьля малебну — марш вайскоўцаў і скаўтаў. Увечары а 19 гадз. у вельмі арыгінальна ўпрыгожанай жанчынамі лягернай залі пачалася ўрачыстая акадэмія, якая складалася з дасканалага рэфэрату, прысьвечанага дню 25-га Сакавіка й інсцэнізацыі ў трох абразох «Песьні Каліноўцаў», напісанае спэцыяльна для сьвята паэткай Н. Арсеньнявай. Інсцэнізацыя, адыграная вучнямі гімназіі ў пастаноўцы кампазытара М. Куліковіча, была вельмі ўдалая і зрабіла моцнае ўражаньне на гледачоў. Жыхары лягеру пакінулі залю ў урачыстым, паважным настроі, усьведамляючы сабе, які цяжкі шлях мусілі прайсьці першыя змагары за незалежнасьць нашае Бацькаўшчыны, падгатаваўшы сваімі чынамі і сьмерцяй грунт да сьветлага Акту 25-га Сакавіка.

Віндзішбэргердорфскі.

МАНІФЭСТАЦЫЙНАЕ ВІТАНЬНЕ ЎКРАІНЦАЎ Ў МІТЭНВАЛЬДЗЕ

У беларускай групе лягеру Лютэнзээ ў Мітэнвальдзе само сьвяткаваньне пачалося 24 сакавіка а 18-ай гадзіне. Перад беларускімі блёкамі сабраліся скаўты ізь сьцягам, моладзь народнае школы й мясцовае жыхарства, каб вырушыць у кірунку памятніка Слуцкім Паўстанцам, пабудаваным летась жыхарамі лягеру. У часе ўпарадкаваньня шэрагаў перад памятнікам ад стараны Мітэнвальду пачуўся гук матораў і паказаліся машыны, перапоўненыя людзьмі. Што гэта? Можа ў лягер прыбываюць новыя жыхары? Не, машыны затрымліваюцца перад памятнікам. Відаць сьцяг і ўніформы ўкраінскага пласту (скаўтаў). Гэта браты ўкраінцы із суседняга лягеру ў складзе дзівочай і хлапцоўскай адзінак пласту й прадстаўнікоў старэйшага грамадзянства прыбылі да нас, каб супольна ўшанаваць памяць тых, якія памерлі, каб жыла Беларусь.

Выступаюць прамоўцы ад беларусаў. У простых, але моцных словах яны абрысоўваюць крыўды й цярпеньні беларускага народу за апошніх 30 год. Апошні зь іх заклікае да ўшанаваньня памяці Палеглых Змагароў хвілінаю цішыні. Хіляцца ўніз сьцягі... цішыня... чуваць толькі прыглушаны плач шмат каго з прысутных. Пасьля гэтага выступае прамоўца ад украінцаў сп. С. «Складаем земны паклон Тым, хто аддаў сваё жыцьцё за Беларусь», — сказаў ён. У наступных словах ён заклікае да цясьнейшага супрацоўніцтва паміж нашымі народамі й канчае: «Няма нашай волі бяз Вашай і Вашай бяз нашай!». Гэтая прамова застанецца надоўга ў сэрцах людзей, што яе чулі.

Складаньне вянкоў. Найпрыгажэйшы вянок ад украінцаў з надпісам: «Борцям за Волю Білорусії — від Українців табору Егерказэрнэ — Мітэнвальд».

Пасьля ўрачыстасьці адбылася паніхіда па палеглых у лягернай царкве, адслужаная мясцовым сьвятаром а. Барысам у прысутнасьці гасьцей і мясцовага грамадзянства.

На наступны дзень адбылася ўрачыстая акадэмія ў лягерным тэатры, ладжаная кіраўніцтвам бел. пачаткавай школы. У афіцыяльнай частцы прамовы беларусаў і гасьцей-украінцаў. У мастацкай частцы адбыліся дэклямацыі патрыятычных вершаў наймалодшымі Лютэнзэяўцамі, харавыя выступленьні, солё на дудцы 6-ці гадовага артысты і ў канцы інсцэнізацыя «Пагоні» Л. Случаніна ў мастацкім апрацаваньні кіраўніка школы сп. В. А.

Гэта сьветлая старонка ўрачыстасьці, але, нажаль, былі і цёмныя. Асобы ведамага напрамку, не ўшанаваўшы ані гэтага сьвятога для кажнага беларуса дня, ані сьцягу, выкарыстоўвалі ўсе магчымасьці, каб расправіцца «с врагами народа кривичами». Мы іх ня будзем судзіць, у канцы асудзіць іх Бог і Гісторыя.

Наддзьвінскі.

СВЯТКАВАНЬНЕ Ў ОСТЭРГОФЭНЕ

Як ува ўсіх большых і меньшых беларускіх селішчах і групах, так і ў Остэргофэне зь вялікай урачыстасьцю былі адзначаныя важныя гістарычныя для нашага народу дні: 23 сакавіка — 85 гадавіна мучаніцкае гэройскае сьмерці Кастуся Каліноўскага і 25 сакавіка — 31 гадавіна абвешчаньня незалежнасьці Беларусі.

23 сакавіка настаўнікі із школьнікамі зладзілі ўрачысты ранічнік у чэсьць Каліноўскага й усіх нашых ведамых змагароў, паўшых за волю й незалежнасьць нашага народу.

Быў прачытаны даклад, прапяяна рад патрыятычных песьняў і быў пастаўлены мантаж «Суд» з паэмы М. Машары «Сьмерць Кастуся Каліноўскага».

24 сакавіка вечарам у прыгожа ўдэкараванай залі адбылася ўрачыстая акадэмія, зарганізаваная мясцовым аддзелам Задзіночаньня Беларускіх Вэтэранаў. Быў прачытаны адным настаўнікам даклад аб Каліноўскім, паўтораны мантаж «Суд» і прапяяна некалькі песьняў.

25 сакавіка ў дзень абвешчаньня незалежнасьці Беларусі раніцаю а 8 гадз. падняцьце сьцягу на гарадзкім пляцы, а вечарам а 19 гадз. адбылася ўрачыстая акадэмія. На акадэміі быў прачытаны глыбокі даклад, адбылося выступленьне хораў — узроснага і школьнага, дэклямацыі патрыятычных вершаў, а таксама народныя беларускія танцы ў выкананьні вучаніцаў гімназіі.

У лягеры ўсе дамы былі прыгожа ўдэкараваныя нацыянальнымі сьцягамі й беларускім гэрбам «Пагоня». Вялікая тэатральная заля падчас акадэміі была перапоўненая мясцовымі й прыехаўшымі спэцыяльна з прыватных памешканьняў беларусамі.

Я. Ч.

І Ў ПЕРАХОДНЫМ ЭМІГРАЦЫЙНЫМ ЛЯГЕРЫ ГОДНА АДСЬВЯТКАВАЛІ

Гістарычную дату 25 сакавіка ўрачыста ўшанавалі і ў пераходным эміграцыйным лягеры ДП у Швайнфурце. У чэсьць гэтага дня ў праваслаўнай царкве была адслужаная Божая Служба сьвятаром Украінскай Праваслаўнай Аўтакефальнай Царквы а. С. Лопуховічам. На Службе прысутнічалі, побач зь беларусамі, прадстаўнікі суседніх нам народаў — Старшыня Украінскага Нацыянальнага Камітэту ў Швайнфурце сп. мгр. Круцько, Старшыня Летувіскага Нацыянальнага Камітэту ў Байройце сп. др. С. Ясюнас, Старшыня Летувіскага Нацыянальнага Камітэту ў Бамбэргу сп. дырэктар Т. Пэтэрс, беларускія й украінскія студэнты-курсанты й частка з царкоўнага ўкраінскага хору з Байройту. Падчас Службы а. Лопуховіч ў украінскай мове сказаў гарачую прамову да прысутных, у якой падчыркнуў доўгае змаганьне беларускага народу за незалежнасьць сваей Бацькаўшчыны. Падчыркнуў гістарычны Акт 25 сакавіка 1918 г. і ягонае значэньне для беларускага народу, Слуцкае паўстаньне, мужнае змаганьне беларускіх партызанаў, а таксама вызвольны рух за межамі Бацькаўшчыны.

Ушаноўваючы памяць лепшых сыноў беларускага народу, якія злажылі жыцьцё за ягонае вызваленьне, а. Лопуховіч вітаў Раду й Урад БНР на чале з Прэзыдэнтам інж. М. Абрамчыкам і жадаў хуткае свабоды й незалежнасьці нашаму краю.

Пасьля Божае Службы для гасьцей было наладжана ў лягерным клюбе скромнае прыняцьце, дзе адбылася шчырая вымена думак паміж прадстаўнікамі трох нацыянальнасьцяў. Коратка прамаўлялі — а. С. Лопуховіч, др. С. Ясюнас і ад беларусаў Анатоль М., які шчыра дзякаваў гасьцям за прыхільнасьць і ўшанаваньне 31-ай гадавіны Вялікага Сакавіка.

Швайнфурт, 25.3.1949 г.

А. Шавель.

НАЦЫЯНАЛЬНАЕ СЬВЯТА Ў ДАНІІ

Дзень 25 сакавіка быў урачыста адсьвяткаваны беларусамі ў інтэрнацыянальным лягеры ў Тыстэд у Данііі. А 9-ай гадзіне раніцы гэтага дня быў вывешаны на афіцыяльным машце ў лягеры беларускі нацыянальны сьцяг, які быў куплены із сабраных фондаў беларусаў у Данії. Многа асобаў іншых нацыянальнасьцяў складала ў гэты дзень нам, беларусам прывітальні з пажаданьнямі хуткага й шчасьлівага павароту ў вольную Бацькаўшчыну. Таксама польскі прадстаўнік і адначасова сакратар інтэрнацыянальнай бібліятэкі ў Тыстэд злажыў нам прывітальні ў гэты дзень.

Тыстэд, Данія.

Вінцук Адважны.

Камунікат

ГАЛОЎНАЙ КВАТЭРЫ ЗБСЧ У СПРАВЕ СКАЎЦКАЙ КАНФЭРЭНЦЫІ 9 — 10 САКАВІКА 1949

На 9 — 12 сакавіка сёлета была вызначаная скаўцкая канфэрэнцыя ў ДП лягеры Шляйсгайм каля Мюнхэну. Канфэрэнцыя мела адбыцца дзеля наладжаньня еднасьці ў арганізацыі і ліквідацыі г. зв. Ватэнштэцкага канфлікту пры абсалютным выэлімінаваньні палітычных і партыйных уплываў на Задзіночаньне Беларускіх Скаўтаў на Чужыне. На канфэрэнцыю прыбылі аднак прадстаўнікі й кіраўнікі палітычных партыяў, якія, ня гледзячы на супрацію Галоўнага Кіраўніцтва, незалежнымі ад яго дзейнікамі, побач фікцыйных і перад канфэрэнцыяй створаных гэтымі палітычнымі дзейнікамі адзінак, былі дапушчаны да ўдзелу ў канфэрэнцыі і такім чынам яна не дасягнула сваёй мэты й давяла да выразнага падзелу ЗБСЧ на дзьве часткі: на адну, якая падзяляе становішча Галоўнага Кіраўніцтва аб няўмешваньні няскаўцкіх і партыйных элемэнтаў, і на другую, якая арганізаваная была гэтымі палітычнымі партыямі й якая на канфэрэнцыі выбрала сваё кіраўніцтва.

Галоўная Квартэра ЗБСЧ пастанавіла далей прадаўжаць сваю дзейнасьць да часу скліканьня новай канфэрэнцыі без палітычнага й партыйнага ўмешваньня ў справы ЗБСЧ, дзе будзе забясьпечана незалежнасьць скаўтынгу ад усіх палітычных партыяў і ўгрупаваньняў і дзе свабодна будуць разьвязаныя ўсе нутраныя справы ЗБСЧ.

Падаючы гэта да ведама ўсім скаўцкім адзінкам ЗБСЧ, Галоўная Кватэра заклікае ўсю моладзь да абароны скаўцкіх ідэалаў, выражаных у скаўцкай прысязе й законах, да ўнезалежненьня арганізацыі ад усякіх палітычных партыяў і ўгрупаваньняў і да вернасьці свайму кіраўніцтву.

Галоўная Кватэра
12 сакавіка 149 г.

Галоўны Кіраўнік В. Пануцэвіч.

НАС ВІТАЛІ

ПРЭЗЫДЫЮМУ РАДЫ БЕЛАРУСКАЙ НАРОДНАЙ РЭСПУБЛІКІ

У дзень трыццаць першай гадавіны абвешчаньня дзяржаўнай незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі выражаем найшчырэйшыя й сардэчныя пажаданьні братняму Беларускаму Народу ў яго далейшым гэраічным змаганьні за адраджэньне сваей свабоды. Мы хочам Вас заверыць, што ў васобе Казацкага Народу Вы заўсёды будзеце мець нязьменнага й вернага прыяцеля й саюзьніка ў дасягненьні супольных для нашых народаў мэтаў і імкненьняў да сваей свабоды й незалежнасьці.

Хай жыве свабодная й незалежная Беларусь!
Хай жыве свабодная й незалежная Казакія!

Старшыня Вярхоўнага Казацкага Прадстаўніцтва (В. Глазкоў).

БЕЛАРУСКАМУ НАЦЫЯНАЛЬНАМУ КАМІТЭТУ

Міжнацыянальны Цэнтральны Камітэт Палітычных Уцекачоў і ДП (ІНКОПОРЭ) у Нямеччыне гэтым мае гонар сэрдэчна прывітаць Беларускі Нацыянальны Камітэт з нагоды 31-ай гадавіны абвешчаньня незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі.

Мы перакананы, што гэройскае змаганьне й самаахвярнасьць Беларускага Народу ня будуць дарэмнымі, што ў супрацоўніцтве з усімі іншымі Народамі, паняволенымі нашым агульным ворагам, Беларусь ізноў здабудзе сваю Свабоду й Незалежнасьць.

Мюнхэн, 25.3.1949.

Прэзыдэнт ІНКОПОРЭ: (—) Др. Артур Моор.
Сакратар: (—) Др. Л. Куус.

БЕЛАРУСКАМУ НАЦЫЯНАЛЬНАМУ КАМІТЭТУ

Эстонскі Нацыянальны Камітэт у Мюнхэне мае гонар шчыра прывітаць Вас з 31-ай гадавінай абвешчаньня незалежнасьці Беларусі.

Супольны цяжкі лёс і супольнае імкненьне да Свабоды й Незалежнасьці цесна злучылі Беларусаў і Эстонцаў. Няхай жа гэтае прыяцельства трывае вякі і, у вызваленай Эўропе, ператворыцца ў самае цеснае супрацоўніцтва для дабра нашых абодвых Народаў.

Няхай жыве свабодная й незалежная Беларусь!
Мюнхэн, 25.3.1949.

Старшыня: Др. Л. Куус.

РЭДАКЦЫІ ГАЗЭТЫ «БАЦЬКАЎШЧЫНА»

Паважаныя Сябры супольнага Змаганьня!

Перасылаючы Вам сяньня нашыя шчырыя прывітаньні з нагоды Вашага вялікага нацыянальнага сьвята, мы адначасна складаем нашыя прывітаньні й усяму братняму нам Беларускаму Народу.

Супольная й так падобная доля й нядоля здружыла й задзіночыла абодвыя народы ў супольным змаганьні супраць найбольшага ворага — Масквы. Мы верым і пэўныя таго, што нашае вызвольнае змаганьне ўвенчыцца поўным пасьпехам і абодвы нашыя народы зажывуць шчасьлівымі ў сваіх вольных і незалежных дзяржавах, а нашая ўзаемная дружба яшчэ больш узмоцніць нашую нацыянальную незалежнасьць.

Хай жыве Беларусь!
Слава Украіне!

За Рэдакцыю «Промінь».
(Ю. Міколін.).

Украінская газэта «Промінь», што выходзіць у Аўстрыі, а таксама газэта «Українські Вісті» зьмясьцілі на сваіх балонах вельмі зычлівыя й гарачыя прывітаньні з нагоды беларускага нацыянальнага сьвята. Гэтак апошняя зь іх, між іншага, піша: **«З нагоды найвялікшага беларускага нацыянальнага сьвята — 31-ай гадавіны абвешчаньня Беларусі Вольнаю й Незалежнаю Дзяржаваю, Рэдакцыя «Українських Вістей» ад імені сваіх чытачоў і шырэйшых украінскіх грамадзкіх колаў выказвае ўсім беларусам і іхным палітычным і грамадзкім арганізацыям братняе пажаданьне мужна й няўтомна ісьці шляхам канчальнага спаўненьня гістарычных пастановаў, вынесеных Радаю Беларускай Народнай Рэспублікі 25 сакавіка 1918 г. у сваей нацыянальнай сталіцы Менску».**

АД РЭДАКЦЫІ

На адрас Рэдакцыі «Бацькаўшчыны» й Беларускага Нацыянальнага Камітэту ў Нямеччыне былі прысланыя прывітаньні з нагоды беларускага нацыянальнага сьвята 25 Сакавіка ад наступных беларускіх установаў і арганізацыяў, а таксама ад паасобных Грамадзян: Прадстаўніцтва Беларускай Народнай Рэспублікі ў Вялікай Брытаніі, Прадстаўніцтва Беларускай Народнай Рэспублікі ў Швэдыі, Прадстаўніцтва Беларускай Народнай Рэспублікі ў Аргентыне, Згуртаваньня Беларусаў у Аргентыне, Часовай Галоўнай Управы Згуртаваньня Беларусаў у Канадзе, Беларускіх Багасловаў Пакрова сьв Міколы ў Рыме, Цэнтралі Беларускіх Студэнцкіх Арганізацыяў на Чужыне (Бэльгія), Саюзу Беларусаў у Бэльгіі, Беларускай Грамады ў Скандынавіі, Згуртаваньня Беларусаў у Вялікабрытаніі, Рэдакцыі часапісу «Беларус на Чужыне» (Лёндан), Беларускага Студэнцкага Згуртаваньня ў Марбургу, Рэдакцыі часапісу беларускай моладзі ў Ангельшчыне «Наперад», Аб'яднаньня Беларускіх Лекараў на Чужыне, Беларускай Групы ў Мюнхэне — Фэльдмохінгу, Беларускай Грамады ў Данії, Пастара Я. Пятроўскага (Аўстрыя), Упаўнаважанага беларускіх эмігрантаў у Аўстраліі.

З прычыны ашчаднасьці месца ня можам памясьціць усіх тэкстаў прывітаньняў. Затое іхным аўтарам Рэдакцыя й БНК складаюць на гэтым месцы шчырую беларускую падзяку.

Зь Беларускага Жыцьця

БЕЛАРУСКА-УКРАІНСКІ ВЕЧАР ПРЫЯЗЬНІ Ў ПАРЫЖЫ

19 лютага сёлета адбыўся ў Парыжы Беларуска-Украінскі супольны вечар прыязьні, на які, апрача беларусаў і ўкраінцаў з Парыжа й правінцыі, прыбыла вялікая колькасьць гасьцей іншых нацыянальнасьцяў. У праграму вечару ўвайшоў канцэрт, ладжаны ўкраінцамі й беларусамі, а пасьля — агульная вечарына. Украінскія песьні й танцы, беларуская «Лявоніха», песьня «Каліниця», «Жыў на сьвеце Лявон» і іншыя, выкананыя нашымі сяброўкамі й сябрамі, выклікалі вялікае ўражаньне й пашану сярод прысутных гасьцей.

Адзін швайцарскі журналісты, які быў на вечары, сказаў: «Я шчаслівы, што меў нагоду прысутнічаць на гэтым вечары, на якім мог пазнаёміцца з Вамі — беларусамі й украінцамі — ды пабачыць Вашае прыгожае народнае мастацтва. Застанецца аб ім у мяне вельмі мілае ўражаньне».

(За часапісам «Моладзь»).

РАДЫЁПЕРАДАЧЫ Ў БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ Ў БЭЛЬГІІ

(Ад собскага карэспандэнта)

Жывучы на Захадзе, у гутарках з чужынцамі беларус штодзённа спатыкаецца з пытаньнямі: «Што такое Беларусь? Дзе яна знаходзіцца? Чым розьніцца беларускі народ ад народу расейскага?» І напасьледак: «А чаму вы не вяртаецеся дамой?» Расказаўшы чужынцу ўсё па парадку, ён адкажа: «Ах, вельмі вам удзячны; я сапраўды шмат ад вас навучыўся! Гэта для мяне зусім новае».

Ці-ж гэта не балючыя пытаньні? Кажны зь іх ведае, дзе знаходзіцца Люксэмбург, Монако ці нават Ліхтэнштайн, а Беларусы, якіх ёсьць амаль 20 мільёнаў, якія некалі на працягу вякоў панавалі на ўсходзе Эўропы, а пасьля доўга змагаліся ды яшчэ й цяпер змагаюцца за свае адвечныя правы, за волю й роўнасьць, — усімі забытыя, іх мала хто сяньня ведае. Гэта вельмі балюча. Над нашай гісторыяй ды нават над фактам існаваньня беларускага народу завешаная цяжкая заслона няпраўды й маны, сатканая нашымі прыгнятальнікамі. Каб яе разьвеяць, кажны з нас, беларускіх выгнанцаў, у якой краіне сьвету ён не знаходзіўся-б, павінен прылажыць сваю частку.

Беларусы ў Бэльгіі ня хочаць стаяць з боку ад агульнае справы. Дзякуючы стараньням Саюзу Беларусаў у Бэльгіі й Беларускага Студэнцкага Згуртаваньня ў Лювэне, пры выдатнай дапамозе шчырага прыяцеля беларусаў а. Эртса, удалося наладзіць у радыястанцыі ў Лімбургу (Гассэльт) першую радыяперадачу ў беларускай мове. У праграму паўгадзіннай аўдыцыі ўваходзяць:

1. Даклад а. Эртса аб Беларусі ў флямандзкай мове.
2. «Пагоня» ў выкананьні мяшанага хору БСЗ у Лювэне.
3. Кароткая інфармацыя аб СБВ для беларускіх работнікаў у Бэльгіі.
4. «Ой сарву я ружы кветку» — у выкананьні беларускіх студэнтак у Лювэне.
5. Верш «Нёман» прадэклямуе студэнтка Л. Р.
6. «Васілёчкі» і «Слуцкія ткачыхі» — выканаюць беларускія студэнткі.
7. «Пайшоў Ясь на лужок» — у выкананьні хору ВСЗ у Лювэне.

Выступ закончыцца кароткім словам да беларусаў у Бэльгіі.

Слухайце гэтую першую беларускую радыяперадачу ў Бэльгіі із радыястанцыі Лімбург (Гассэльт) 5 красавіка а гадз. 21 — 21, 30 на хвалі 202, 3 м. і із радыястанцыі Бруксэля III 18 красавіка а гадз. 15,45 — 16,15 на хвалі 237 м.

Мы верым, што гэты наш выступ прычыніцца да шырэйшага азнаямленьня заходня-эўрапэйскага слухача зь беларускім пытаньнем, беларускім народам, ягонай культурай і песьняй. Трэба спадзявацца, што гэты выступ будзе не апошнім.

(Лювэн, 18.3.1949).

Ар. Ал.

КАНФЭРЭНЦЫЯ ІМКА — ІВКА

Ад 28 да 31 сакавіка сёлета ў Прын (паўдзённая Баварыя) адбылася міжнацыянальная канфэрэнцыя ІМКА — ІВКА, у якой бралі ўдзел прадстаўнікі ад 11-ці нацыянальнасьцяў ДП. Ад беларускай нацыянальнасьці брала ўдзел 5 прадстаўнікоў. Для вядзеньня нарадаў быў выбраны прэзыдыюм канфэрэнцыі, у склад якога ўвайшлі ад кажнае нацыянальнасьці па аднаму прадстаўніку. Ад беларусаў быў выбраны ў склад прэзыдыюму сп. палк. Ф. Кушаль. Кажнае паседжаньне канфэрэнцыі вёў іншы старшыня ў парадку чарговасьці нацыянальнасьцяў, якія ўваходзілі ў склад прэзыдыюму. Заданьнем канфэрэнцыі было апрацаваньне пляну працы на будучыню сярод ДП усіх нацыянальнасьцяў. Для каардынаваньня працы паміж паасобнымі нацыянальнасьцямі пастаноўлена зарганізаваць Міжнацыянальную Раду ІМКА — ІВКА пры галоўнай яе кватэры на амэрыканскую зону, у склад якой будуць уваходзіць па два прадстаўнікі ад кажнай нацыянальнасьці. Трэба адзначыць, што гэтая канфэрэнцыя ўрэгулявала шмат справаў, якія дадуць магчымасьць шырака разгарнуць працу ІМКА — ІВКА сярод ДП усіх нацыянальнасьцяў.

Удзельнік.

АГУЛЬНАЯ ЗБОРКА САЮЗУ ЛІЦЭНЦЫЯТАЎ ДП — ПРЭСЫ

8 сакавіка адбылася ў Бад-Кісінген чарговая паўгодняя зборка Саюзу ліцэнцыятаў ДП — прэсы. На зборцы былі разгледжаныя некаторыя справы, зьвязаныя з прэсаю ДП розных нацыянальнасьцяў і быў выбраны новы прэзыдыюм Саюзу ў наступным складзе:

Старшыня — Я. Беласэвіч (паляк), заступнікі старшыні—др. М. Ліппочы (мадзяр) і Ф. Зээт (латыш), **сакратар — П. Манькоўскі (беларус)**, скарбнік М. Адынцоў (расеец).

ДЭЛЕГАЦЫЯ БНК У АЎСТРАЛІЙСКАЙ ІМІГРАЦЫЙНАЙ КВАТЭРЫ

Дэлегацыя Беларускага Нацыянальнага Камітэту наведала 24 сакавіка Галоўную Аўстралійскую Імігрыйную Кватэру ў Нямеччыне. Паездка мела на мэце выясьніць прычыны недапушчэньня эмігравать у Аўстралію беларускіх сем'яў зь дзецьмі. У блізка гадзіннай размове з шэфам аддзелу было ўсебакова выясьнена палажэньне беларускіх ДП у заходняй Эўропе й наагул паінфармавана аб Беларусі й змаганьні беларускага народу за незалежнасьць. Выясьнілася, што аўстралійскія прадстаўнікі былі аб нас дрэнна й аднабакова паінфармаванымі.

Шэф імігрыйнага аддзелу дзякаваў за інфармацыі й выясьненьні, а таксама абяцаў неадкладна распачаць захады дзеля памыснага палагоджаньня нашае просьбы. Эмігрыйная схэма можа быць зьменена толькі аўстралійскім міністэрствам імігрыі, куды і будзе накіраваная нашая просьба. Трэба мець надзею, што праз месяць — другі будзе дазволена эмігравать у Аўстралію беларусам сямейным і сямейным парам зь дзецьмі.

Ліст з Аргентыны

Ад Рэдакцыі: Старшыня Згуртаваньня Беларусаў у Аргентыне сп. К. Мерляк просіць нас зьмясьціць на балонах «Бацькаўшчыны» копію ягонага адкрытага ліста да рэдакцыі газэты «Беларускае Слова» ў тэй надзеі, што гэная газэта яго ня зьмесьціць. Ідучы на спатканьне сп. К. Мерляку ніжэй і зьмяшчаем у скарочаньні ўспомнены ягоны ліст.

«Пішу вам паведамляем, што мы Вашую газэту «Беларускае Слова» № 1 і 2 атрымалі па 5 егз., за што Вам дзякуем. Толькі тут у нас адна просьба: памясьціць у гэтай газэце нашую маленькую заўвагу. Да вонкавага выгляду, афармленьня й зьместу газэты мы ня робім заўвагаў, бо, згодна беларускай прыказкі, «якія самі — такія й сані». Няма чагось лепшага вымагаць.

Расходзіцца тут пра камунікаты, зьмешчаныя ў абодвых першых нумарох, у разьдзеле «Перасяленскія Справы» што да дазволаў уезду ў Аргентыну й прадстаўніцтва БЦП у Аргентыне. Каб ня ўводзіць людзей у сман, мы пачуваемся да абавязку падаць да ведама Вам, Сп. Рэдактары, і ўсяму беларускаму грамадзянству ў Нямеччыне наступнае:

Калі ходзіць аб магчымасьцях даставаньня дазволу на ўезд у Аргентыну, то сяньня гэта ёсьць абсалютна немагчымым, як гэта ўжо паведамляла Управа ЗБН сваім лістом з 11.12.1948 г. у газэце «Бацькаўшчына». Там пісалася, што аргентынскі ўрад пастанавіў людзям, народжаным за «жалезнай заслонай», не выдаваць дазволу на ўезд у Аргентыну, а тым, што ўжо выдадзеныя, устрымаць да асобнага распараджэньня. Гэтае палажэньне не зьмянілася й да сяньняшняга дня. Дык гэтае паведамленьне «Беларускага Слова» абсалютна не адказвае праўдзе й абодвы камунікаты зьўляюцца простай хлуснёй, не саліднай прапагандай з боку рэдакцыі газэты і пустым пацяшаньнем беларусаў у Нямеччыне, якіх ужо даволі пацяшалі й абяцалі за апошнія тры гады. Але ЗБА пачало сваю акцыю выраблення дазволаў яшчэ ў сакавіку 1948 г., на якія ўжо прыехалі ў Аргентыну з Даніі і Бэльгіі. Зь Нямеччыны-ж ня прыехаў ніхто на выраблення дазволы з гэтае прычыны, што сьпіскі на ўезд з прычыны новага распараджэньня былі ўжо спозьненымі, бо лётніцкая пошта тады яшчэ ня была наладжанай у Нямеччыне, а звычайная пошта даходзіла сюды толькі пасьля трох месяцаў.

Высланыя сьпіскі зь Міхэльсдорфу на 300 асобаў «адмысловаму прадстаўніку» ляжаць у ягонай валізе і мусіць будуць прадаўжаць ляжаць да неазначанага часу. Зацеміць трэба, што гэтыя сьпіскі прыгатаваныя на расейскай мове. Цікава, як была-б гэтая справа рэфэраваная адпаведным эмігрыйным уладам?

Апошнімі часамі пачалі паяўляцца тут прадстаўнікі для беларускага народу, як грыбы пасьля дажджу: «представитель для беларуссов с имперского союза», «представитель для беларуссов от «Суворовцев», прадстаўнік расейскай зарубежнай Царквы для праваслаўных беларусаў, прадстаўнік БЦП і БЦР. Дык бачыце, скольк і іх тут ёсьць, якія хочаць ушчасьліві беларускі народ і ўсе хочаць гэтага ў цеснай сувязі з аргентынскімі ўладамі. Гэтыя апошнія, як выглядае, ня маюць рабіць нічога іншага, як толькі прыймаць «беларускіх прадстаўнікоў».

Прадстаўніцтвы БЦР і БЦП у Аргентыне й розныя другія моцна спазьніліся, каб пацягнуць за сабой людзей пустымі абяцанкамі і непраўдзівай прапагандай. Трэба лепш пазытыўна працаваць, а вынік працы лепш пераканае за ўсякую хлусьню.

Калі ходзіць аб беларускім прадстаўніцтве ў Аргентыне, то тут зьяўляецца ім толькі Згуртаваньне Беларусаў у Аргентыне, арганізацыя апартыйная, якая гуртуе ўсіх беларусаў добрае волі, і якая на працягу так кароткага часу, бо няцэлага году, паказала сваю працу. Гэтую працу заўважылі аргентынскія ўлады й зьвяртаюцца да ЗБА ў розных справах, асабліва эмігрыйных.

Дык калі хто цікавіцца справай эміграцыі ў Аргентыну, то можа зьвяртацца з гэтым да ЗБА, якое і надалей будзе прадаўжаць сваю працу, як і раней. Зазначаем, што ЗБА дагэтуль прымала бяз выключэньня ўсе заявы. Але ня ведаю, як паступіць Управа ЗБА што да тых, якіх заявы знаходзяцца ў «адмысловага прадстаўніка».

З пашанаю
Старшыня ЗБА: К. Мерляк.

ШУКАЮЦЬ...

Бацьку **Прынуса Паўлу**, матку **Аляксандру** (дзявочае прозьвішча **Васілеўская**) зь вёскі Зайнішча, Дзярэчынскага пав. (Слонімшчына), якія перад першай сусьветнай вайной выехалі у ЗША — сын Прынус Гарасім.

БЯРЫЦЕ ПРЫКЛАД З «АЎСТРАЛІЙЦАЎ»!

Вельмі паважаны спадару Рэдактару!

Мы, група беларусаў у Аўстраліі — правінцыі Вікторыя, сабраўшыся 21 лютага сёлета й абмеркуваўшы Ваш заклік падтрымаць матарыяльна нашую адзіную беларускую газэту «Бацькаўшчыну», прыйшлі да вываду, што поўным матарыяльным падтрыманьнем можна лічыць толькі такое, якое будзе сыстэматычнае. Дзеля гэтага мы прыракаем Вам, што будзем высылаць на выдавецкі фонд «Бацькаўшчыны» па 10 шылінгаў ад асобы што месяца на працягу ўсяго 1949 г. Тыя з прысутных на зборцы, што мелі запазычанасьць «Бацькаўшчыне» за студзень і люты, адразу яе заплацілі й грошы сяньня высылаем поштай дзеля пераказаньня Вам.

Мы ўважаем, што кажнаму беларусу ёсьць ведама, якую важную ролю адыгрывае «Бацькаўшчына» ў нашым нацыянальна-вызвольным руху, а таму ніхто не пашкадуе дзеля яе існаваньня гэтай невялічкай ахвяры, а некаторыя змогуць даць і больш.

Мы заклікаем усіх беларусаў у Аўстраліі і ўсіх іншых краінах узяць з нас прыклад і, як мага, спрычыніцца да рэгулярнага выходжаньня адзінай нашай газэты на чужыне.

Просім усіх беларусаў, пражываючых у Аўстраліі, грошы на выдавецкі фонд «Бацькаўшчыны» перасылаць на адрас:

Mr. Nicolas Scabey
Saxton Camp, Taryil-Bren
Victoria. Australia.

або на адрас:

Association of Whiteruthenians in Gt. Britain
52, Penn Road. Hollway.
London N. 7. England.

Аўстралія, 5.3.1949 г.

З пашанаю Мікола С.
Упаўнаважаны Групы.

Ад Рэдакцыі. Рэдакцыя «Бацькаўшчыны» шчыра дзякуе нашым дарагім суродзічам у далёкай Аўстраліі за іхную выдатную помач для нашае газэты, бачачы ў гэтым найлепшую праяву іхнага патрыятызму й нацыянальнага абавязку. Адначасна мы заклікаем нашых суродзічаў ува ўсіх іншых краінах сьвету ўзяць прыклад з нашых «аўстралійцаў» і спрычыніцца да нармальнага існаваньня адзінай нашай газэты на чужыне шляхам прысыланьня ня толькі падпіскі, але й сыстэматычнай матарыяльнай дапамогі.

Калі няма іншай магчымасьці, грошы для «Бацькаўшчыны» просім сдаць за пасярэдніцтвам Згуртаваньня Беларусаў у Вялікабрытаніі згодна вышэй пададзенага адрасу.

СВОЙ СВАЙГО ПАЗНАЎ І НА ШІВА ПАЗВАЎ?

Гамбурскі расейскі часапіс «Путь» у № за 20.3.49 г. у зацемцы «Зьезд праваслаўнай моладзі» падаў наступную вестку:

«12 і 13 сакавіка сёлета ў мястэчку Хорнэбург, у памяшчэньні ахвотна адпушчаным для гэтае меты арганізацыяй ІМКА, адбыўся зьезд праваслаўнай моладзі. Сустрэча гэтая была скліканая Расейскім Студэнцкім Рухам і Клюбам моладзі лягеру Фішбэк і сьцягнула звыш 60 удзельнікаў, прыехаўшых із розных лягераў брытанскае зоны. З асаблівым задаваленьнем быў адзначаны ўдзел на зьезьдзе групы моладазі ад беларускага лягеру Ватэнштэт, якая гэтым самым падчыркнула ахвоту браць удзел у супольна-праваслаўнай працы моладзі...».

Ня трэба й даказваць, што расейскія адзінанедзялімаўцы пад праваслаўнай фірмай увесь час маскуюць сваю русыфікатарскую работу сярод праваслаўных нерасейскіх народаў. Найбольш вымоўным прыкладам гэтага ў дачыненьні да нас было прылучэньне был. беларускага япіскапату да Расейскай Зарубежніцкай Царквы, што насіла выключна палітычны характар. Таму ўдзел апанаванага зарубежнікамі беларускага лягеру Ватэнштэт у выш менаваным зьезьдзе ёсьць адным із далейшых довадаў русыфікатарскае палітыкі зарубежнікаў.

(Ам.).

НАШЫЯ ПРАДСТАЎНІЦТВЫ ПАЗА НЯМЕЧЧЫНАЙ:

1. У Вялікабрытаніі:
Association of Whiteruthenians in Gt. Britain,
52 Penn Road, Holloway, London N. 7, England.
2. У Францыі.
Mr. Nicolai Lysucha,
8, R-Gambetta, St. Quen, Seine. France.
3. У Бэльгіі:
Mr. Janka Labouka,
8, Place Hoover, Louvain. Belgique.
4. У Швэдыі:
Ing. Albert Ossowski,
Norra Vägen 7, Halmstad. Sweden.
5. У Італіі:
Todar Mazura,
Roma, via Carlo Cattaneo 2, Italia.
6. У Даніі:
S. Sastajlo, Dragsbek Lejer Bl. III, Thisted. Danmark.
7. У ЗША:
Eng. Nikolai Choroshko,
59 4057 th, Drive, Maspeth, L, I. N. Y. USA.
8. У Канадзе:
Mr. Jozeph Pitushka, 131 Manning Ave, Toronto, Ont. Canada.
9. У Аргентыне:
Association Bielorusa en la Argentina,
Calle Maza, 150, Buenos-Aires. Argentina.
10. У Аўстраліі:
Boris Dziedowiec,
Imbil, Queensland, Sub-Department of Forestry. Australia.

Whiteruthenian Weekly „The Fatherland"
Authorized by EUCOM Hq. Civil Affairs Division 20 July 48, Nr. UNDP 225. Circulation 3500 copies.
Administration: (13b) Osterhofen, Ndby., Whiteruthenian, D.P.Camp.
Licensee: Wladimir Bortnik.
Edited by: Whiteruthenian National Commitee.
Printed by: Georg Jakob, München 8, Pützichstraße 3a.